# Актыўныя прыёмы на ўроках літаратуры: 6–8 клас

**А. М. Новікава,**
настаўнік беларускай мовы і літаратуры
вышэйшай кваліфікацыйнай катэгорыі
СШ № 5 г. Рагачова

Галоўная мэта навучання беларускай літаратуры – далучэнне вучняў да мастацтва слова ў кантэксце духоўнага і сацыяльна-гістарычнага жыцця народа і фарміраванне на гэтай аснове мастацкага мыслення, эстэтычных пачуццяў, чытацкай і маўленчай культуры, выхаванне чалавека з глыбокім гуманістычным і дэмакратычным светапоглядам, з развітым пачуццём нацыянальнай і асабістай самапавагі, патрыёта, адданага агульначалавечым ідэалам, асобы з выразна выяўленымі творчымі схільнасцямі, здольнай успрыманне прыгожага выкарыстаць для выпрацоўкі стымулу маральнага, інтэлектуальнага і духоўнага развіцця.

Настаўнік, безумоўна, ставіць перад сабой пытанне: як вучыць, каб дасягнуць гэтай мэты? Якім павінна быць навучанне, каб яно падахвочвала вучня да творчасці, развівала яго здольнасці, рабіла яго не пасіўным слухачом на ўроку, а актыўным удзельнікам? Чым кіравацца, каб урок літаратуры стаў адкрыццём новага, незабыўнага, таямнічага і цікавага? Гэтыя пытанні хвалююць мяне як настаўніка асабліва востра, калі школьнікі  ўступаюць у падлеткавы ўзрост (6-8 клас) і вучэбная дзейнасць губляе сваё вядучае значэнне. У маёй практыцы выявіліся супярэчнасці паміж патрабаваннямі праграмы па беларускай літаратуры і інтарэсамі школьнікаў: узмацненне цікавасці вучняў да тэм і жанраў, якія шырока прадстаўлены на тэлеэкране, інфарматызацыя грамадства і негатыўны ўплыў гэтага працэсу на адносіны да кнігі і літаратуры ўвогуле. Асэнсаванне вышэй названых пытанняў і супярэчнасцей прывяло да пошуку эфектыўных сродкаў развіцця пазнавальнай дзейнасці на ўроках літаратуры. І для мяне такім сродкам стала выкарыстанне актыўных прыёмаў навучання. Я выкарыстоўваю актыўныя прыёмы на ўсіх этапах урока.

Ужо на матывацыйным этапе я сутыкнулася з праблемай: як  настроіць на паспяховую работу класны калектыў? Плённая праца будзе толькі ў тым асяроддзі, дзе

ўсе адчуваюць утульнасць, дзе пануе атмасфера добразычлівасці. І я палічыла мэтазгодным выкарыстоўваць прыёмы, якія спрыяюць узнікненню ў вучняў станоўчых эмацыянальных адносін да пазнавальнай дзейнасці: “Памяняемся месцамі”, “Які я?”, “Камплімент”, “Алітэрацыя”, “Інтэрв’ю”, “Падары кветку”. Гэтыя прыёмы дапамагаюць дынамічна пачаць урок, задаць патрэбны рытм, забяспечваюць працоўны настрой і спрыяльную атмасферу.

Спынімся на прыёме “Алітэрацыя”. Сутнасць у тым, што кожнаму неабходна назваць свайго суседа і даць характарыстыку на першую літару яго імя. Напрыклад, Максім – мілы, мужны. Гэты прыём спрыяе адначасоваму ўключэнню ўсіх вучняў у сумесную дзейнасць і паказвае значымасць кожнага з іх.

Каб актывізаваць пазнавальную дзейнасць, трэба і моцнае эмацыянальнае ўздзеянне. Таму на пачатку ўрока я выкарыстоўваю прыём “Індуктар”. Гэта можа быць музыка, рэпрадукцыі карцін, малюнкі, урыўкі з кінастужак, мультфільмаў. Напрыклад, пры вывучэнні прыродаапісальнай лірыкі ў 6-м класе я прапаную цыкл “Поры года” А. Вівальдзі. На ўроку пры вывучэнні аповесці В. Быкава “Жураўліны крык” у 8-м класе вучні ўбачылі ўрыўкі з кінастужкі “Доўгія вёрсты вайны”.

Развіццю пазнавальнай дзейнасці на матывацыйным этапе спрыяюць праблемныя сітуацыі, выкарыстанне такіх актыўных прыёмаў, як “Завяршы фразу”, “Так ці не”, “Лагічны ланцужок”, “Лаві памылку”, “Чаканне”, “Дрэва прадказанняў”, “Рассыпаныя паштоўкі”, “Веру - не веру”. На гэтым этапе прасочваецца гатоўнасць вучняў да пазнавальнай дзейнасці, да пераадолення цяжкасцей, правільнасць фармулявання і разумення задач навучання, што стаяць перад імі, выбар патрэбнага дзеяння для іх вырашэння.

Вельмі зручны, на мой погляд, прыем “Чаканне”, таму што кожны з вучняў можа падзяліцца тым, што ён чакае ад урока, або расказаць, што ведае па тэме.

Прыём “Завяршы зразу” дапамагае вучням, выкарыстоўваючы набытыя раней веды, уключыцца ў працу. Я прапаную, напрыклад, такія фразы:

- Сапраўдны сябар той, хто… (А. Васілевіч “Сябры”)

- Дрэнны сын горшы за чужога чалавека, бо… (З. Бядуля “На Каляды к сыну”)

- Прыязджаючы ў вёску да бабулі, я перш-наперш… (В. Карамазаў “Дзяльба кабанчыка”)

Найбольш хутка ў працэс пазнання вучняў дапамагае ўключыць прыём “Асацыяцыя”. Яны ствараюць асацыятыўныя рады да ключавога слова (тэмы ўрока) і потым вылучаюць самае істотнае, што дапамагае адлюстраваць асабістыя адносіны да праблемы. Напрыклад, на ўроку ў 6-м класе па творы К. Чорнага “Насцечка” вучні складаюць асацыятыўны рад да паняцця “сяброўства”.

Узнаўленню і фіксацыі ведаў, уменняў, навыкаў спрыяе выкарыстанне прыёма “Веру - не веру”. Напрыклад, пры вывучэнні ў 7-м класе твора Я. Брыля “Урокі пані Мар’і” я выкарыстоўваю гэты прыём. Дзеці ў парах адзін аднаму задаюць пытанні па змесце. Напрыклад: Ты верыш, што ў Даніка Мальца былі мянушкі Сівы, Гусак, Манька? Ты верыш, што пан Цаба вучыў дзяцей беларускай мове?

На аперацыйна-пазнавальным этапе вучні засвойваюць новыя веды, авалодваюць дзеяннямі, вырашаюць праблему ўрока. На гэтым этапе я часта выкарыстоўваю прыёмы, якія патрабуюць працы ў групах, бо ўпэўнілася, што пры групавой форме арганізацыі пазнавальнай дзейнасці кожны вучань мае магчымасць выказаць сваё меркаванне, школьнікі больш разважаюць, думаюць, а не проста механічна запамінаюць матэрыял. Развіццё пазнавальнай дзейнасці на аперацыйна-пазнавальным этапе ўрока я ажыццяўляю з дапамогай такіх актыўных прыёмаў, як “Кластар”, “Тонкія і тоўстыя пытанні”, “Пчаліны вулей”, “Чатыры куты”, “Жакей і конь”, “Анкета героя”, “Лесвіца жыцця героя”.

Прыём “Чатыры куты” – спосаб узаеманавучання ў мікрагрупах. Перад урокам развешваю ў кутах класа каляровыя лісты паперы. Кожнаму вучню прапаную адказаць на пытанне і прайсці ў кут, які адпавядае зробленаму выбару. Калі з прапанаваных варыянтаў не задавальняе ні адзін, то вучні праходзяць у цэнтр класа. Пасля таго як усе вучні зрабілі выбар, яны арганізуюць камунікацыю паміж сабой, кожны тлумачыць іншым свой выбар. Прыклады пытанняў:

- Хто ці што вінаваты ў тым, што жонка паўстанца Грынкевіча спазнілася на дзесяць хвілін: Пора-Левановіч (чырвоны кут), вераб’іная ноч (зялёны кут), Мураўёў (сіні кут), улан (жоўты кут)? (У. Караткевіч “Паром на бурнай рацэ”)

- Што стала прычынай здрады Аліка Аўсеева і Івана Пшанічнага: выхаванне ў сям’і (чырвоны кут), іх перадваеннае жыццё (зялёны кут), самі (сіні кут), ваенны час (жоўты кут)? (В. Быкаў “Жураўліны крык”)

Прыём “Жакей і конь” мэтазгодна выкарыстоўваць, калі на вывучэнне тэмы даецца адна гадзіна. Першая група атрымлівае карткі з пытаннямі, другая – з правільнымі адказамі. Кожны “жакей” павінен знайсці свайго “каня”.

На этапе замацавання новага матэрыялу выкарыстоўваю прыёмы, якія накіраваны на асэнсаванне вучнямі сваёй пазнавальнай дзейнасці: “Чыё гэта?”, “Лагічны ланцужок”, “Займі пазіцыю”, “Карэктар”, “ПАПС-формула”, “Белыя плямы”. Вучні вызначаюць узровень засваення матэрыялу і ступень дасягнення задач. Кантрольная функцыя на гэтым этапе ўрока не павінна з’яўляцца самамэтаю, а павінна пераўтварацца ў пастаянную зваротную сувязь “вучань-настаўнік”, бо, на думку М. І. Запрудскага, менавіта зваротная сувязь “аказвае на вучняў эмацыйнае ўздзеянне і служыць моцным матывуючым фактарам: вучань радуецца сваім поспехам і бачыць, над чым канкрэтна яму яшчэ трэба папрацаваць; дае вучням канструктыўныя рэкамендацыі па карэкцыі іх дзейнасці; фарміруе адэкватную самаацэнку вучняў” [1, с. 33].

Напрыклад, пры вывучэнні ў 6-м класе твора У. Караткевіча “Лебядзіны скіт” дзеці пры дапамозе прыёма “ПАПС-формулы” (П – пазіцыя, А – абгрунтаванне, П – прыклад, С – меркаванне) вызначаюць галоўную праблематыку казкі з пазіцыі хана Бату, Юсуфі, старца.

У 8-м класе пры вывучэнні твора В. Карамазава я прапаную прыём “Чыё гэта?” Вучні атрымліваюць карткі з імёнамі герояў і характарыстыкі. Трэба вызначыць, каму належаць характарыстыкі, і пакласці іх пад патрэбную картку. У якасці характарыстык могуць быць апісанне знешнасці герояў, іх выказванні або выказванні іншых персанажаў наконт іх. Напрыклад, карткі “Сцяпан”, “Маці”, “Ніна”, “Вера”, “Коля”. Моўныя характарыстыкі: “Во, хоць кабанчык прывёў да маці”, “А не трэба мне ніякія кажухі. Не хачу. Рэжце ўсіх сваіх авечак”, “Па суседзях не пабягу. Другі ў хляве”, “Сцёпа, ты куды? Дамоў паехалі, Сцёпа”, “Можа ты яго гадаваў?”

На этапе рэфлексіі мэтазгодна прымяняць тыя прыёмы, што дапамагаюць вучням не толькі ацаніць свой эмацыянальны стан, свае вучэбныя дасягненні, але паўтарыць, замацаваць веды, асэнсаваць сваю дзейнасць на ўроку. Гэта прыёмы “Святлафор”, “Мне гэта спатрэбіцца...”, “Алфавіт”, “Партфель. Мясарубка. Сметніца”, “Тры-два-адзін”, “Ключавое слова”, “Што, калі...”.

Напрыклад, у 6-м класе пры вывучэнні твора А. Васілевіч “Сябры” пры выкарыстанні прыёма “Што, калі...” мяркуецца ўключэнне пытанняў, якія пачынаюцца са слоў: “Што, калі ...” Дадзеныя пытанні дазваляюць вучням па-новаму, з другога боку паглядзець на праблему, вылучыць свае здагадкі, свае гіпотэзы развіцця падзей, спрыяюць развіццю гіпатэтычнага мыслення вучняў.

Што, калі ... Лёня забыў пра крыўду і паклікаў Грышку?

Што, калі ... Лёня не заблукаў у лесе?

Што, калі ... Грышка не адважыўся прыйсці да хворага Лёні?

Дзеля вызначэння ўзроўню ўсведамлення зместу вывучанага я прапаную прыём “Нясканчаныя сказы” (Сёння ў мяне атрымалася... У мяне ўзніклі складанасці з… Я зразумеў, што...). Змест пытанняў будзе залежаць ад тэмы і відаў работы на ўроку. Праз рэфлексійную дзейнасць вучні ўсведамляюць свае пазнавальныя інтарэсы, матывацыю дзейнасці, цяжкасці. РЯна павінна стаць той крыніцай, якая будзе стымуляваць далейшую пазнавальную дзейнасць вучняў (дома і на наступных уроках).

Вынікі паказалі, што выкарыстанне актыўных прыёмаў развівае пазнавальную дзейнасць вучняў на ўроках беларускай літаратуры: назіраецца пазітыўная дынаміка ўзроўню навучанасці па беларускай літаратуры, павышаецца цікавасць да прадмета, выніковасць удзелу вучняў у прадметных і творчых конкурсах. А гэта значыць, што актыўныя прыёмы з’яўляюцца эфектыўнымі для развіцця пазнавальнай дзейнасці вучняў на ўроках беларускай літаратуры.

**Літаратура**

1. Запрудскі, М. І. Актыўная ацэнка – новая стратэгія навучання / М. І. Запрудскі // Актыўная ацэнка: метад. дапам. / укл. Н. Ільініч. – Мінск, 2013. – С. 29–39.

2. Руцкая, А. В. Новыя формы ўрокаў па беларускай літаратуры / А. В. Руцкая // Беларуская мова і літаратура. – 2011. – № 11. – С. 44–47.

3. Щукина, Г. И. Активизация познавательной деятельности в учебном процессе / Г. И. Щукина. – М.: Просвещение, 2011. – 206 с.

4. Самасюк, А. У. Творчыя заданні па сучаснай беларускай літаратуры / А. У. Самасюк// Беларуская мова і літаратура. – 2018. – №10.

5. Ярмоцык, Г. В. Урок – гульня па апавяданні Алены Васілевіч “Сябры” ў 6-м класе / Г. В. Ярмоцык // Беларуская мова і літаратура. – 2019. – №1.